УДК 811

І.А. Блізнюк, ст. выкл. (ВА РБ, г. Мінск)

# КРЫНІЦЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ КУЛЬТУРЫ ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ КУРСАНТАЎ У СІСТЭМЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

Паняцце «культура» знаёма кожнаму, але змест яго нельга вызначыць адназначна, кожны чалавек можа ўкладаць свой сэнс у гэта паняцце. Бясспрэчным з'яўляецца тое, што культура – самая вялікая каштоўнасць чалавека, грамадства, цывілізацыі. Аднак культура немагчыма без мовы. Толькі тое, што абазначана і выказана словамі, становіцца культурным здабыткам пэўнага народа. Праз мову чалавек атрымлівае ўяўленне аб свеце і грамадстве, членам якога ён стаў, аб культуры, аб сістэме каштоўнасцей.

Усё, што звязана з культурай у нашым грамадстве сёння надзвычай актуальна. Узрастае роля культурнай палітыкі і ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, што ў першую чаргу абумоўлена асобай значнасцю духоўнай сферы ў жыццядзейнасці армейскага арганізма, пашырэннем спектра духоўных патрэб ваеннаслужачых, іх роляй ва ўмацаванні такіх паняццяў, як гонар абаронцы Радзімы, вернасць воінскаму абавязку, любоў да Айчыны.

Заўважана, што існуе ўзаемасувязь паміж узроўнем культуры ваеннаслужачага і яго прафесійнымі якасцямі. Той, хто мае патрэбнасць у павышэнні сваіх ведаў, займаецца ваенна-тэхнічнай творчасцю, захапляецца творамі літаратуры і мастацтва, што раскрываюць ратныя подзвігі, асабістыя ўражанні ўдзельнікаў баявых дзеянняў, як правіла, адрозніваецца высокай ваенна-прафесійнай актыўнасцю.

Змест курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» арыентуе курсантаў на практычнае валоданне беларускай мовай у ваеннай сферы дзейнасці. Важнай састаўной часткай праграмы дысцыпліны з'яўляецца культуралагічны аспект, паколькі культура афіцэра, у тым ліку і моўная, як і яго прафесіяналізм, адносяцца да найбольш значных фактараў воінскай дзейнасці.

Пытанні культуры не складаюць асобны ізаляваны раздзел. Кожныя заняткі – гэта практычнае сутыкненне з культурай, перш за ўсё праз яе асноўны носьбіт – мову. Кожнае слова адлюстроўвае беларускую культуру, за кожным словам стаіць суб'ектыўнае, абумоўленае толькі гэтай моўнай культурай, своеасаблівае ўражанне аб навакольным свеце.

Культуралагічны падыход у выкладанні дысцыпліны выконвае некалькі функцый. Асноўныя з іх – вучэбная, прафесійная, выхаваўчая, пазнавальная, развіццёвая.

Вучэбная функцыя заключаецца ў сістэматызацыі і паглыбленні ведаў курсантаў аб законах і нормах беларускай мовы на ўсіх узроўнях, у вывучэнні граматычных, семантычных і іншых асаблівасцей беларускай спецыяльнай (ваеннай) лексікі, у прыватнасці – тэрміналогіі, праблем яе развіцця, функцыянавання і выкарыстання; у азнаямленні з пытаннямі культуры беларускай мовы ў афіцыйна-справавой сферы. Навучанне ажыццяўляецца праз такія віды моўнай дзейнасці, як вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу, вуснае маўленне, пісьмовыя практыкаванні, творчыя працы, пераклады, дыскусіі і інш. Заданні на засваеннне лексікі, у тым ліку і прафесійнай, накіраваны на стварэнне моўнай базы для ўключэння курсантаў у актуальную для іх сферу зносінаў на роднай мове.

У выкладанні дысцыпліны выразна прасочваецца прафесійная функцыя. Каб дасягнуць поспеху ў прафесійнай дзейнасці сучаснаму спецыялісту неабходна дасканала валодаць навыкамі культуры мовы і маўлення, лінгвістычнай і камунікатыўнай кампетэнцыяй у прафесійных зносінах. Гэта датычыцца і ваеннаслужачых, жыццё і дзейнасць якіх строга рэгламентаваны. Спецыфіка маўлення ў ваенным асяроддзі абумоўлена характарам задач, якія стаяць перад Узброенымі Сіламі, асаблівасцямі ваеннай арганізацыі, умовамі, у якіх дзейнічаюць ваеннаслужачыя. Мова ваеннага чалавека павінна быць пісьменнай, выразнай, дакладнай. Кожны афіцэр валодае камандзірскай мовай, якая адпавядае духу ваенных статутаў. Практычна гэтыя задачы вырашаюцца праз лексічныя тэмы «Культура мовы і маўлення», «Прафесійна арыентаванае маўленне», «Публічнае выступленне», якія складаюць раздзел «Культура прафесійнага маўлення». Усе тэмы накіраваны на павышэнне моўнай культуры курсантаў, на выпрацоўку навыкаў пабудовы лагічна правільнага выказвання, вядзення дыялогу ў адпаведнасці з патрэбамі прафесійнай дзейнасці і ў неафіцыйных сітуацыях, на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу.

Галоўная мэта, якую пры гэтым ставіць выкладчык, выкарыстоўваючы метады і віды работ па прывіцці навыкаў моўнай культуры, заключаецца ў тым, каб паказаць курсантам, што культура афіцэра, у тым ліку і культура мовы, як і яго прафесіяналізм, адносяцца да ліку найбольш важных фактараў вайсковай дзейнасці. Асаблівая ўвага акцэнтуеца на тым, што афіцэр заўсёды быў

прыкладам высокай культуры паводзінаў, культуры мовы, красамоўства, выхаванасці, духоўнасці.

Падрыхтоўка маладога спецыяліста высокай гуманітарнай культуры павінна спалучацца з яго асэнсаванай любоўю да роднай мовы, шаноўнымі адносінамі да духоўных каштоўнасцей нацыянальнай культуры як сродку інтэлектуальнага развіцця і станаўлення асобы. Гэта абумоўлівае выхаваўчую функцыю ўвогуле ўсёй дысцыпліны. Раздзел дысцыпліны «Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей» уключае вучэбны матэрыял, неабходны для разумення сутнасці мовы і яе сувязі з культурай народа, на аснове якога і выхоўваюцца адпаведныя пачуцці і адносіны.

Пазнавальная і развіццёвая функцыі даюць магчымасць больш поўнага пагружэння ў культуру мовы. Яны накіраваны на развіццё тых сацыяльна і прафесійна значымых уласцівасцей асобы курсанта, што адыгрываюць найбольш важную ролю для працэсу пазнання, а менавіта: на развіццё маўленчых здольнасцей, лагічнага выкладу думак, на выхаванне такіх рысаў, як увага, актыўнасць да ўспрыняцця вучэбнага матэрыялу, мэтанакіраванасць, уменне вучыцца, а таксама на пашырэнне кругагляду курсантаў, на станаўленне асобы і фарміраванне светапогляду, што самым непасрэдным чынам звязана з эфектыўнасцю іх будучай прафесійнай дзейнасці.

Варта адзначыць, што ўсе адзначаныя функцыі не існуюць адасоблена, яны дапаўняюць адна адну ў кожнай тэме. Так, напрыклад, галоўная задача раздзела «Лексікалогія» – гэта вывучэнне лексічных пластоў беларускай мовы, слоаўварэння ваеннай тэрміналогіі, накапленне агульнаўжывальнай і прафесійнай (ваеннай) лексікі. Але ж тут разглядаецца паходжанне ваенных тэрмінаў, а гэта – працэс пазнання.

Як бачым, культуралагічны падыход у выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» накіраваны перш за ўсё на авалоданне ўсімі моўнымі функцыямі і рознымі формамі зносінаў для таго, каб авалоданне прафесійнай культурай было сродкам узбагачэння духоўнага свету курсанта, міжасобаснай камунікацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская мова. Прафесійная ваенная лексіка: вучэб. дапам. для курсантаў і слухачоў устаноў вышэйшай адукацыі па ваенных спецыяльнасцях / Т.І. Блізнюк, І.А. Блізнюк. – Выд. 2-е, дап. – Мінск: ВА РБ, 2013. – 300 с.